■ Тэхналогіі



# 4G запушчана ў Мінску

## Першы інфраструктурны аператар beCloud запусціў у эксплуатацыю сетку LTE Advanced (LTE Release 10)

**Спачатку мінчане, а пасля жыхары абласных цэнтраў і буйных раённых гарадоў змогуць карыстацца паслугамі 4G — мабільнай сувяззю чацвёртага пакалення, якая прыходзіць на змену 3G.**

Праектаванне, будаўніцтва і эксплуатацыю забяспечыў інфраструктурны аператар — СТАА «Беларускія воблачныя тэхналогіі», які працуе пад брэндам beCloud. Выкарыстоўваць гэтыя магчымасці можа любы зацікаўлены аператар. «Мабільныя ТэлеСістэмы» сталі першымі, хто правёў неабходную мадэрнізацыю.

Стварэнне адзінай сеткі сотавай электрасувязі па тэхналогіі LTE рэалізуецца ў адпаведнасці з інвестыцыйным праектам «Стварэнне і эксплуатацыя аб'ектаў інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры з выкарыстаннем найноўшых тэлекамунікацыйных тэхналогій і тэхналогій апрацоўкі даных», а таксама Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2012 года «Аб умовах рэалізацыі інвестыцыйнага праекта ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

Паводле слоў **генеральнага дырэктара beCloud Сяргея ПАБЛАГУЕВА**, асноўнай сёння лічыцца ўдасканаленая тэхналогія LTE Advanced, якая дазваляе перадаваць не толькі даныя, але і голас. На момант пачатку работы сталічнай сеткі LTE пакрыццё забяспечаць 150 базавых станцый. У наступным годзе тэхналогія будзе ўдасканальвацца ў Мінску і прыйдзе ў Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна і Магілёў, а да 2020 года — у райцэнтры з колькасцю насельніцтва не менш за 50 тысяч чалавек.

На пачатку LTE Advanced будзе працаваць у дыяпазоне 1800 МГц, пазней — 2600 МГц.

Генеральным падрадчыкам праекта стала кампанія «Бел Хуавэй Тэхналаджыс», якая забяспечыла пастаўку абсталявання, яго мантаж і пусканаладачныя работы і здала заказчыку гатовыя для эксплуатацыі сістэмы.

«Хуткасці ў сетцы LTE Advanced будуць значна вышэйшымі, чым у сетцы 3G, — адзначае **намеснік гендырэктара па камерцыйных пытаннях beCloud Міхаіл ДУКА**. — Сярэднія хуткасці будуць складаць каля 30 Мбіт/с, але ніякіх абмежаванняў для дасягнення 100-140 Мбіт/с у абанентаў не будзе. Праўда, трэба ўлічваць, што рэальныя паказчыкі хуткасці будуць залежаць ад аддаленасці абанента ад базавай станцыі, якасці карыстальнікаў, якія адначасова знаходзяцца ў зоне дзеяння базавай станцыі і жадаюць атрымаць доступ у інтэрнэт, якасці і класа тэлефона, планшэта і інш».

Сёння ў свеце налічваецца 442 LTE-сеткі, запушчаныя ў камерцыйную эксплуатацыю ў 147 краінах.

Тэрміны LTE і 4G не з'яўляюцца сінонімамі. 4G — чацвёртае пакаленне мабільнай сувязі з высокай хуткасцю перадачы даных і павышанай якасцю галасавой сувязі. LTE — адна з такіх тэхналогій, якая мае на ўвазе толькі перадачу даных. LTE па сваіх тэхнічных характарыстыках не адпавядае патрабаванням 4G. Таму сёння асноўнай лічыцца ўдасканаленая тэхналогія LTE Advanced.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■

■ Надвор'е

# ЗНОЎ ЦЁПЛЕНЬКАЯ ПАЙШЛА

## На выхадныя сіноптыкі абяцаюць дождж і +5–10 градусаў удзень

**Гэты снежань больш нагадвае познюю восень, і ў наступныя 3-5 дзён чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Атлантычныя цыклоны, якія будуць перамяшчацца па поўначы Еўропы, прынясуць новую порцыю цёплага вільготнага паветра. Таму ў выхадныя чакаецца анамальна цёплае надвор'е, якое больш адпавядае тэмпературнаму рэжыму кастрычніка.

Сёння тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў атмасферных франтоў, якія перамяшчаюцца з Заходняй Еўропы. Удзень у многіх раёнах прагназуюцца невялікія дажджы. Месцамі чакаецца туман, раніцай галалёд, а на асобных участках дарог галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе 1-6 цяпла, а на захадзе да плюс 8 градусаў. Амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы і ў суботу. Уначы па поўдні краіны месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 1-7 градусаў, удзень — ад 3 да 10 цяпла. У нядзелю будзе ўжо воблачнае з праясненнямі надвор'е. Уначы на большай частцы тэрыторыі ўдзень пройдуць кароткачасовыя дажджы. Па поўдні ўначы месцамі туман. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе 3-8 цяпла, а ўдзень максімальная тэмпература будзе дасягаць плюс 5-10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, і ў пачатку наступнага тыдня захаваецца цёплае надвор'е. У панядзелак чакаецца воблачнасць з праясненнямі, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 1-6 градусаў, а ўдзень — ад 3 да 9 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Сацыяльная выстава 50+

# ШЧАСЛІВЫМ І ЗДАРОВЫМ СТАЦЬ НІКОЛІ НЕ ПОЗНА

**Пачынаючы з учарашняга дня ў Палацы мастацтва, што размешчаны ў самым цэнтры сталіцы, на вул. Казлова, асабліва шматлюдна. З усіх канцоў горада едуць сюды тыя, каму за 50. Бо сацыяльная выстаўка-кірмаш для старэйшага пакалення «50 плюс», якая адкрылася ў Мінску ўжо пяты раз, менавіта для іх. Асноўная задача гэтай выставы — дапамагчы людзям элегантнага ўзросту знайсці новыя магчымасці для стварэння паўнавартаснага, шчаслівага жыцця пры выхадзе на пенсію. А тавары і паслугі, прадстаўленыя тут, дапамогуць ім у гэтым.**

Вельмі важнае месца ў жыцці прадстаўнікоў старэйшага пакалення займае ўсё, што звязана са здароўем. Гэтая тэма — цэнтральная і на выставе. Тут любы ахвочы можа хутка і без праблем памераць артэрыяльны ціск і атрымаць кансультацыю ўрача-тэрапеўта і герыятра, зрабіць кардыяграму і тут жа атрымаць яе расшыфроўку, вызначыць сваю вагу і індэкс масы цела і нават даведацца ўзровень цукру ў крыві.

— У вас узровень глюкозы 5,3 — выдатны вынік, — усміхаецца наведвальніца жанчына ў белым халаце.

— А колькі наогул складае норма? — пытаецца тая.

— У апошні час яе пераглядзелі ў бок павышэння. Цяпер нормай лічыцца ўзровень да 6,2.

— О, мне можна ў космас ляцець, — радасна выдыхае «пацыентка».

***

Урач-эндакрынолаг Гарадскога эндакрыналагічнага дыспансера Жанна Кірыленка гатова пракансультаваць любога ахвотнага: прапальпаваць шчытападобную залозу, адказаць на ўсе пытанні. У чарзе да яе, якая, зрэшты, хутка рухаецца, стаяць нават з вынікамі ўльтрагукавога даследавання: каб доктар расшыфраваў. «У вас усё ў парадку, ёсць невялікі вузельчык, але гэта не страшна. Працягвайце назірацца і абавязкова піце таблеткі, якія вам прызначыў ваш доктар!» — рэкамендуе Жанна Міхайлаўна пажылой жанчыне.

— За тры гадзіны працы я ўжо паглядзела 152 чалавекі, — кажа эндакрынолаг. — Што самае цікавае — да мяне звярнуліся 147 жанчын і толькі 5 мужчын!

***

Жанчыны і на самой справе складаюць пераважную большасць наведвальнікаў выставы. А якая жанчына не думае пра знешнасць?

— Дзяўчаты, хто апошні ў цырульню? — пытаецца ў чаргі пажылая дама ў какетлівым капялюшыку. Тут, на трэцім паверсе выставы, працуюць чатыры майстры-цырульнікі і адзін майстар па манікюры, якія па сацыяльных расцэнках гатовыя зрабіць прыгожай любую наведвальніцу. ...Вось адна з іх устае з крэсла майстра і ўсміхаецца сваяму адбітку ў люстэрку: новая стрыжка да твару!

***

Побач арганізавана зона бытавых паслуг са спецыяльнымі тарыфамі для пенсіянераў. Абсалютна бясплатна можна атрымаць кансультацыі натарыусаў, юрыстаў, псіхолагаў. Спецыялісты кансультуюць і па пытаннях санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення, прапануюць розныя турыстычныя і экскурсійныя праекты. А кожная раніца на выставе на працягу амаль цэлага тыдня будзе пачынацца з 15-хвіліннай гімнастыкі пад кіраўніцтвам вядомых чэмпіёнаў пенсійнага ўзросту.

Свае пазнавальна-забаўляльныя праграмы — выступленні творчых калектываў, сустрэчы з паэтамі і іншыя цікавыя мерапрыемствы — на выстаўцы прадстаўяць усе дзевяць тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва сталіцы. Так што добры настрой напярэдадні Новага года ўсім наведвальнікам забяспечаны!

Уваход на ўсе мерапрыемствы выставы вольны.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

■

**Извещение о проведении 30 декабря 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»**

| **Предмет торгов №1** |
|---|
| Здание административно-хозяйственное (наименование – здание административно-производственного корпуса с инвентарным номером 420/С-1070) общей площадью 1573,3 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей с бойлерной, кузницей, складом с инвентарным номером 420/С-1071) общей площадью 385,8 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей со складом материалов с инвентарным номером 420/С-1072) общей площадью 1017,4 кв. м; здание многофункциональное (наименование – здание гаражей со столярным цехом, лабораторией, складом с инвентарным номером 420/С-1599) общей площадью 1032,6 кв. м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание проходной с инвентарным номером 420/С-1600) общей площадью 126,4 кв. м; здание специализированное коммунального хозяйства (наименование – здание туалета с инвентарным номером 420/С-35883) общей площадью 12,2 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-44516) общей площадью 11936,1 кв. м;<br>кран-балка (инв. № 041229); пресс гидравлический (инв. № 041202); станок вертикально-сверлильный ВСН-12 (инв. № 1031); станок настольный (инв. № 044341); станок токарный 1 м63 (инв. № 041677); два стеллажа изготовленных (инв. №№ 070869 и 070870); станок точильно-шлифовальный (инв. № 0124); автозаправочный блок-пункт АБП 00.00.000ПС (инв. № 020090); зеленые насаждения /ель, каштан, рябина, липа/ (инв. № 90022); комплектная трансформаторная подстанция 2 КТПТАС-В/К400/10/0,4-08У1 (инв. № 040088); станция контейнерная автозаправочная КА 33 (инв. № 020089); две топливораздаточные колонки (инв. №№ 020091 и 020092). |
| Площадь земельного участка – 1,9533 га,<br>кадастровый номер 441300000009000041 |
| Местонахождение –<br>Гродненская область, Лидский район, г. Лида, ул. Мицкевича, 41<br>(д. 41; д. 41, корп. 1; д. 41, корп. 2; д. 41, корп. 3; д. 41, корп. 4; д. 41, корп. 5) |
| Начальная цена – 4 809 722 830 белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка – 480 000 000 белорусских рублей |
| Обременение – аренда |
| **Предмет торгов №2** |
| Здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытовых помещений с котельной с инвентарным номером 420/С-35887) общей площадью 70,6 кв.м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытового корпуса со складскими помещениями с инвентарным номером 420/С-36635) общей площадью 252,4 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 3 с инвентарным номером 420/С-47349) общей площадью 6456,88 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 4 с инвентарным номером 420/С-47350) общей площадью 2781,0 кв. м;<br>агрегат минерального порошка ДС-185 (инв. № 042674); агрегат целлюлозной добавки (инв. № 042690); асфальтобетоносмеситель ДС-158 (инв. № 042652); бункер-накопитель /металлоконструкция/ (инв. № 042695); грохот СМД-107 (инв. № 042372); конвейер ленточный КЛ-РОЛ-5 (инв. № 041663); конвейер ленточный ТК-172 (инв. № 041655); три конвейера ТК-18 (инв. №№ 041532, 041533 и 041534); подогреватель жидкого теплоносителя (инв. № 042658); четыре цистерны 20 м³ (инв. №№ 020100, 020101, 020102 и 020103); комплектная трансформаторная подстанция КТП-250 (инв. № 040086); два резервуара стальных 60 и 50 м³ соответственно (инв. №№ 20097 и 593,3) |
| Сведения о земельных участках:<br>кадастровый номер 423684000060000002, площадь – 0,5957 га;<br>кадастровый номер 423684000060000003, площадь – 1,3591 га;<br>423684000060000004, площадь – 1,2704 га |
| Местонахождение – Гродненская область, Лидский район,<br>Дубровенский с/с, 12, 14 в районе дер. Обманичи |
| Начальная цена – 2 672 006 674 белорусских рубля с учетом НДС |
| Сумма задатка – 260 000 000 белорусских рублей |
| Обременение – аренда |
| **Предмет торгов №3** |
| Административно-бытовое здание общей площадью 966,8 кв. м (инвентарный номер 611/С-327), ремонтная мастерская общей площадью 2352,3 кв. м (инвентарный номер 611/С-328), проходная общей площадью 60,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-332), гараж общей площадью 1078,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-333), склад общей площадью 88,4 кв. м (инвентарный номер 611/С-331), канализационная насосная станция общей площадью 13,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-330), станция пожаротушения общей площадью 35,0 кв. м (инвентарный номер 611/С-329), трансформаторная подстанция общей площадью 42,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-334), пожарный резервуар (инвентарный номер 611/С-29951), наружные сети канализации (инвентарный номер 611/С-31344, адрес: г. Березино, пер. Промышленный), наружные водопроводные сети (инвентарный номер 611/С-31345, г. Березино, пер. Промышленный), вагон-дом (инв. № 016), вагон-общежитие (инв. № 0023), линия электропередач (инв. № 515), сеть электроснабжения (инв. № 0516) и 26 единиц оборудования:<br>вулканизатор (инв. № 464), аппарат высокого давления (инв. № 1437), генератор EUROPOWER сварочный (инв. № 15), компрессор С-415М (инв. № 00442), пресс РХ-15 (инв. № 455), сварочный аппарат ТДМ-503 (инв. № 95), станок металлорежущий 2М-112 (инв. № 182), станок настольный сверлильный 2МШ2 (инв. № 00439), станок обдирочно-шлифовальный 2Н-1 (инв. № 196), станок отрезной ножовочный (инв. № 0438), станок радиально сверлильный (инв. № 00440), станок сверлильный (инв. № 177), станок токарно-винторезный, модель 161-БМ (инв. № 47), станок точильно-шлифовальный (инв. № 437), установка насосная высокого давления ЭСКО 15-20 (инв. № 48), электроталь (инв. № 505.1), три отопительных котла «МИР-95» (инв. № 010, инв. № 054, инв. № 062), электрогидравлический калун (инв. № 12), трансформатор ТМ-400/10 (инв. № 100), контейнер для хранения топлива (инв. № 223), подъемник ПТО-42 (инв. № 458), бойлер «Бренеран» (инв. № 56), контейнернозаправочная станция (инв. № 476), трансформатор ЭК-250 (инв. № 106) |
| Площадь земельного участка – 2,0296 га,<br>кадастровый номер 620450100001000276 |
| Местонахождение – Минская область, Березинский район,<br>г. Березино, пер. Промышленный, д. 6 (д. 6, корп. 1, д. 6, корп. 2, д. 6, корп. 3, д. 6, корп. 4, д. 6, корп. 5, д. 6, корп. 6, д. 6, корп. 7) |
| Начальная цена – 11 129 553 929 белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка – 1 000 000 000 белорусских рублей |
| Обременение – аренда |

**Продавец имущества** – ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, 8, 220099, г. Минск, телефон (017) 212-50-62.

**Организатор торгов** – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов** – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **30 декабря 2015 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 18.12.2015 по 28.12.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб.6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017) 212-50-62 (ОАО «Автомагистраль»).**